Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі ... рацыі: Вільня, Віленская вул. 12— ... leńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 10 Вільня, Субота 7-га траўня 1927 г. Год 1

Пасеўная дапамога, ці палітыка?

„Паны палажэньня“ ў Заходняй Беларусі ў кожным асьветным ці гаспадарчым пачынаньні беларусаў бачаць заўсёды „палітыку“.

Вядзецца праца ў кірунку усьведамленьня сялянскае масы аб патрэбе мець школу ў роднай мове (— што лічыцца ў-ва ўсім культурным сьвеце першым варункам дзеля карыснасьці школьнае навукі).—гэта „палітыка“.

Творацца адумысныя таварыствы, каб закладаць прыватныя беларускія школы, ладзіць бібліатэкі, народныя дамы, арганізоўваць публічныя лекцыі агульнаасьветнага характару, — і гэта „палітыка“, раз гэта робяць беларусы.

Творыцца беларуская каапэрацыя,—ізноў „палітыка“.

Паўстае да жыцьця адзіная на ўсю Заходнюю Беларусь крэдытная ўстанова каапэратыўнага характару — Беларускі Каапэратыўны Банк,—ну, гэта дык ужо „яўна антыпаньствовая работа“...

А што-ж бачым з другога боку?

Ня будзем казаць аб запраўды-ж чыста палітычных заданьнях польскае дзяржаўнае школы для беларускага насяленьня: гэта-ж ясна кожнаму і бяз нашага тлумачэньня. Зьвернем увагу адно толькі на найнавейшую праяву запраўднае палітычнасьці навет у такой рэчы, як... *урадавая дапамога на насеньне.* Усе даныя аб гэтай справе возьмем з абшарніцкае газэты—органу самога пана міністра Мэйштовіча, „Слова“.

Аказваецца, што выдача ўрадавых пазык на пасеў аддадзена ў рукі выключна польскіх банкаў і банчкоў. Беларускі Каапэратыўны Банк з яго аддзеламі — абойдзены пры гэтым, хаця якраз ён стаіць найбліжэй да пацярпеўшага летась ад неўраджаю беларускага сялянства...

Ды гэта ня ўсё. Усе гэныя „дабрадзеі“, якім даручана выдаваньне пасеўных пазык, паводле сваіх статутаў, могуць выдаваць пазыкі (ясна-ж: з *сваіх* грошы!) толькі сваім сябром, якія запісаліся ў банчок і заплацілі пай. Пры невялікіх выдачах (ад 50 да 100 зл. на гаспадарку) аплата пая—25 злотых — такі страшны выдатак для селяніна, што і ў ліхвяра не даражэй дастаць будзе пазыку за вялікія навет працэнты. Але аказалася, што гэты прымус—зусім не такі ўжо прымусовы, і што ад статутаў, выдаючы *казённую* пазыку, можна адступаць! Прынамся адпаведныя ўстановы „пастанавілі“ адлічаць на пай з выдаванае насеннае пазыкі 10% усяе сумы і ня менш 1/4 пая (знача, ня менш, як 6 зл. 25 гр.). Да гэтага трэба дадаць 2 зл. ўступных, 50 гр. за кніжку сяброўскую і блянкі, урэшце—працэнты за пазычаныя грошы (5½ рац. гадавых).

Пераважаючай сумай пазыкі зьяўляецца 50 злот. Вось, „Слова“ палічыла, што—пры выдачы пазыкі ў ліку 50 зл., селяніну адлічаюць з гэтае сумы: 6 зл. 25 гр. на пай, 2 зл. уступных, 2 зл. 75 гр. працэнтаў, каля 50 гр. кніжка і блянк, а ўсяго разам... *„толькі“ 11 зл. 50 гр.* Гэтак *замест 50 злотых селянін дастае на куплю насеньня ўсяго толькі 38 зл. 50 гр.* (трыдцаць восем злотых 50 грошы).*).

Агульная сума крэдыту на насеньне, вызначанага ўрадам для Віленшчыны на гэты год, дасягае 1,200,000 злотых. Калі ўсе пазыкі лічыць агулам па 50 злотых на гаспадарку, дык з гэтае сумы запраўды-ж на насеньне ідзе толькі 924,000 зл., а ў касы польскіх банчкоў, празначаных галоўныя чынам дзеля падтрыманьня асаднікаў, пастурае 276,000 злот., знача—бязмала *чацьвертая часьць пасеўнага крэдыту*!

Мы пытаемся: ці гэта — гаспадарчае мерапрыемства, ці — проста *палітычны крок*, каб коштам дзяржаўнага скарбу і пацярпеўшага ад недароду сялянства падтрымаць фінансова польскія крэдытныя ўстановы?!

*) „Слова“ пацяшае, што гэныя грошы маюць быць вернены пасьля сплаты пазыкі,—але тымчасам будуць ляжаць у касе таго ці іншага банчка...

Да скліканьня сэсіі Сойму.

Газэты пішуць, быццам урад мае склікаць Сойм — ці то ў другой палове траўня, ці то ў першай—чэрвеня. Польская прэса, асабліва правая, страшэнна клапоціцца аб тым, каб Сойм быў скліканы канешна. Справа—ў тым што Сойм быў распушчаны ўрадам у часе, калі распачаў разгляд цэлага раду законапраектаў, якія маюць падставовае значэньне для дзяржавы. Асабліва клапоціцца правая прэса аб тое, каб урад даў Сойму (— яго права-цэнтравай большасьці) магчымасьць правясьці **зьмену выбарнага закону.**

Аб неабходнасьці зьмены выбарнай „ордынацыі“ вельмі цікаўна ды напросту цынічна піша правая прэса. Ясна ж, што асабліва йдзе рэч аб „Крэсах“...

Орган „беспартыйнай эндэцыі“, „Кур. Варшавскі“, адкінуўшы ўсялякія канстытуцыйныя цэрамоніі, ясна піша, аб што йдзе „народовым партыям“ Польшчы. Трэба, каб новы закон „забясьпечыў польскаму грамадзянству на Крэсах прадстаўніцтва ў Заканадаўчых Палатах — **незалежна ад варункаў нацыянальнага складу насяленьня**“... Польскае грамадзянства хоча ў Парляманьце „прадстаўляць“ Край і яго насяленьне—„незалежна“, ці—ня гледзячы на гэтае насяленьне... І вось, гэткую „задачу“ трэба вырашыць Сойму. І знайшліся аж 4 „Бузэкі“, якія падалі ў Сойм „добрыя“ праекты, з якіх „сам“ Глombіньскі зрабіў адзін, але ўжо зусім „дасканалы“...

Паслухайце, як хараша даводзіць эндэцкая газэта патрэбу — для ўратаваньня польскага „прадстаўніцтва“ ў Парляманьце—ўнезалежніць парляманцкія выбары ад... выбіраючага насяленьня!

„Выбары 1922 г. сьцьвярдзілі бясспрэчна, што выбары на ўсходніх землях ня можна стаўляць у залежнасьць ад становішча цёмных масаў няпольскага насяленьня, якога ў некаторых ваяводствах— 80 працэнтавая большасьць (можа навет — звыш 90%!—Р). Паўтарэньне гэтай памылкі (1922 году) можа ня толькі фатальна адбіцца на паглядах на нас за-граніцай, але, што яшчэ горш, можа выклікаць ўпадак духу ды заняпад творчай энэргіі... польскага насяленьня гэтых зямель“.

Запраўды ж нельга з большай „шчырасьцяй“ сцьвярдзіць банкруцтва так званай „польскасьці“ „крэсаў“! Эндэцкая „рэйхсвэра“ слушна баіцца, што поўны правал польскага прадстаўніцтва з „крэсаў“ у парляманьце—гэта будзе праўдзівы скандал, які змусіць эўрапэйскую дэмакратычную апінію пераглядзець нанова ўсё тыя „даводы“ „польскасьці Крэсаў“, якімі на Парыжскай Канфэрэнцыі 1919 г. так удатна апэравалі паны Дмоскі і Падэрэвскі — на падставе „статыстыкі“ п. Студніцкага...

Другі аргумант газэты — яшчэ больш цікаўны.—Эндэцкая газэта сама сьцьвярджае, што польскае насяленьне „крэсаў“ — дзеля падтрыманьня свайго „духу“ і „творчай энэргіі“ — вымагае вынятковых варункаў і асаблівых прывілеяў для свайго істнаваньня і працы... Газэта сьцьвярджае, што нармальныя варункі дэмакратычнай дзяржаўнасьці, а перадусім—роўнасьць выбарнага права — папросту заб'юць напавал гэты „дух“ і гэтую „творчую энэргію“ польскага насяленьня на „крэсах“... Дык трэба ня толькі забясьпечыць прадстаўніцтва жменьцы палякоў на беларускай зямлі, але адначасна—калі не пазбавіць зусім мандатаў, дык паменшыць лічбу іх ад няпольскага насяленьня „крэсаў“. Адным словам, каб падняць дух і творчую энэргію польскага насяленьня, трэба падвойна панізіць дух і творчую энэргію няпольскага.. Дзякуем за шчырасьць!

Трэці доказ газэты на карысьць зьмены „ордынацыі“ і асаблівай аховы прывілеяў польскага „жывёлу“ на „крэсах“—такі:

Выбары па старому закону ізноў зьбяруць у „проці-польскі блёк“ усе меншасьці ў Польшчы. Але ў выбарнай барацьбе з гэтым блёкам польскае грамадзянства на „крэсах“ будзе выступаць „разьбітае на часткі, распыленае“... — Бо ж фатальныя „маёвыя“ падзеі леташняга году не дадуць яму стварыць навет такую „адналітую выбарную сілу“, якая істнавала ў 1922 г. (Хіена“!). Дык і за гэтыя фатальныя „зьмены ў псіхіцы польскага грамадзянства, разьбіўшыя „Хіену“, мае адказываць падвойнай крыўдай для сваіх асноўных палітычных правоў—няпольскае насяленьне „крэсаў“! Вось-жа трэба польскаму насяленьню „Крэсаў“... Трэба „забясьпечыць“ столькі мандатаў, каб усе яго найдрабнейшыя часткі і партыі атрымалі **мандаты...**

Чацьверты довад—ну, ведама-ж, „камуністычныя настроі „крэсавага“ няпольскага насяленьня, якія, прыкрываючыся нацыянальнымі лёзунгамі, узапраўднасьці зьяўляюцца выразна „антыпаньствовымі“... Дзеля таго „блёк меншасьцяў“ даў-бы пры выбарах па старому закону пераважна „паслоў-камуністаў“...

Усе гэтыя доказы маюць пэўна-ж такую пераканаўчую сілу, дый не для адных толькі права-цэнтравых партыяў, што трэба думаць, і „сялянская“, „сацыялістычная“ ці „радыкальная“ польская лявіца ня будзе лішне працівіцца, каб правіца правяла ўсе праектаваныя зьмены ў выбарным законе, прынамся тыя, што датычуць „крэсаў“... Тады ўсё будзе аднача сна і легальна, і карысна для ўсіх польскіх партыяў на „крэсах“.

Для лявіцы, як можа і для ўраду, справа толькі ў тым, каб ня браць на сабе ўсяе ненавісьці за пагоршаньне дэмакратычнага выбарнага закону. А калі гэтага цяжару для свайго сумленьня не баіцца правіца ды „Пяст“, у дадатак ствараючыя дзеля гэтага легальную большасьць у Сойме, дык — чаго-ж лепшага жадаць?!...

Дык трэба думаць, што Сойм ня толькі будзе скліканы але моі захаваны на даўжэйшы час, чым на гэта пазваляе Канстытуцыя, каб толькі ён здолеў зрабіць гэтую патрэбную дзеля далейшай „кансалідацыі Польскай Дзяржавы“ працу...

Апрача таго, як ведама, Сойм мае скончыць працу над законамі аб самаўрадах, над законам аб сабраньнях, зацьвярдзіць рад міжнародавых трактатаў і заграніччную пазыку. Ці ўсю гэтую праграму дазволіць Сойму цалком выпаўніць „вышэйшая сіла“, — гэта ўжо другое пытаньне.

Узнауленьне нямецкай актыунасьці.

Сэнсацыйная прамова мін. справядлівасьці.

На зьезьдзе нямецкіх нацыяналістаў у Сілезіі міністар справядлівасьці Гэргт, адзін з павадыроў нямецкага ваяўнічага нацыяналізму, сказаў прамову, у якой выляжыў праграму нямецкага ўраду ў галіне „ўсходніх спраў“.

Міністар заявіў, што сучасныя нямецкія граніцы на Усходзе—немагчымыя, і нямецкі ўрад будзе рашуча імкнуцца да іх перагляду. Аб заключэньні нейкага трактату з Польшчай, які-б гарантаваў гэтыя граніцы, ня можа быць ніякай мовы. Сучасны габінэт якраз гэтыя ўсходнія справы высунуў на першае месца ў сваей палітыцы, дый — прыпадак, што большасьць міністраў паходзіць якраз з усходніх зямель Нямеччыны. Далей Гэргт заявіў, што ўрад распачне больш актыўна абарону нямецкай меншасьці ў Польшчы.

Немцы рыхтуюцца да новай дыпляматычнай акцыі.

Нямецкія газэты паведамляюць, што нямецкі ўрад мае ў бліжэйшым часе распачаць рашучую акцыю ў напрамку поўнага ачышчэньня ракі Рэйну ад чужаземнай акупацыі. Нямецкі ўрад мае зараз-жа заявіць усім саюзьнікам, што Нямеччына ўжо не здаволіцца больш частковай эвакуацыяй, але патрабуе—поўнай і акаўчальнай. Нямеччына, увайшоўшы ў Лігу, павінна мець поўную роўнасьць з іншымі яе сябрамі, без чаго яе ўчасьце ў Лізе ня мае ніякага сэнсу.

Газэты, якія маюць блізкую сувязь з урадам, пішуць па адрасу Польшчы:

Польскае грамадзянства павінна зразумець, што Нямеччына ніколі ня прызнае сучаснай польска-нямецкай граніцы. Што датычыць узнаўленьня польска-нямецкіх гаспадарчых перагавораў, дык Польшча павінна зразумець, што першым варункам гэтага ўзнаўленьня зьяўляецца поўнае і рашучае спыненьне польскім ўрадам усялякага перасьледаваньня нямецкай меншасьці ў Польшчы.

Правая нямецкая прэса яшчэ больш адкрыта піша аб тым, як прадстаўляюць сабе немцы „паварот да вялікадзяржаўнай магутнасьці Нямецкай дзяржавы“.—„Дасягнуць гэтай галоўнай мэты сваей немцы, як ясна, ня могуць шляхам мірнага паразуменьня з былымі праціўнікамі ў Вялікай вайне. Дык—трэба пачакаць мамэнту, калі гэтыя дзяржавы — у выніку сваіх уласных абмылак ды вінаў—пападуць ізноў у цяжкое палажэньне. Тады яны павінны будуць зьвярнуцца да Нямеччыны аб дапамогу... А за гэтую помач — павінны будуць заплаціць Нямеччыне, аддаўшы ўсё тое, што забралі ў яе цяпер“...

Нямецкі ўрад, з пачыну самога прэзыдэнта Гіндэнбурга, мае назначыць у Нямецкую Сілезію асобнага Дзяржаўнага Камісара, які меціме заданьнем—сабраць усе матэрыялы аб стратах і крыўдах, якіх нарабіла арганізаванае палякамі паўстаньне ў часе знамянітага плебісцыту ў 1921 г.

Характэрная гісторыя ў Кенігсбэргу.

Клюб людоўцаў (партыя мін. Штрэзэмана) падаў у Прускі Сойм інтэрпэляцыю, вельмі характэрную для сучасных польска-нямецкіх адносінаў.

Справа ў тым, што ў дзень польскага „нацыянальнага сьвята“ польскі консул у Кенігсбэргу наладзіў урачыстую імшу ў касьцёле, ды запрасіў на ўрачыстасьць прадстаўнікоў нямецкіх уладаў. Зразумела,—ніводзін з запрошаных нямецкіх саноўнікаў не пайшоў на ўрачыстасьць. А ўся прэса страшэнна абурылася на „нячувана нетактоўную ды зухвалую агітацыю польскай пляцоўкі ў Нямеччыне“... Навет афіцыяльны орган самога Штрэзэмана (мін. заграніччных спраў), падаючы інтэрпэляцыю, лічыць „абурэньне і пратэст нямецкіх уладаў у Кенігсбэргу зусім зразумелымі“. Газэта кажа, што—„кожнаму ясна, што азначае гэткае запрашэньне. Польскія палітычныя чыньнікі ўсьцяж вядуць кампанію за далучэньне Усходняй Прусіі да Польшчы. Дык зваблюваючы мясцовых дзяржаўных ды самаўрадавых урадоўцаў на польскую ўрачыстасьць польская заграніччная прапаганда мела выклікаць на ўсім сьвеце ўражаньне, быццам ў Прусіі істнуюць пэўныя імкненьні ў бок Польшчы. І гэта—у той час, калі ўся Усходняя Прусія настроена аднадушна проці Польшчы“. У канцы орган міністра заграніччных спраў дае жорсткую навуку тым нямецкім каталіцкім духоўным, якія бястактна згадзіліся прыняць учасьце ў касьцельнай урачыстасьці ў дзень польскага нацыянальнага сьвята... „Трэба, каб касьцельныя ўлады Усх. Прусаў мелі столькі такту, каб здолелі прадбачыць... магчымасьць надужыцьця з боку польскіх уладаў, дый — не памагалі ім у гэтым“...

Фашыстаўская «Канстытуцыя Працы».

Вялікая Фашыстаўская Рада прыняла апрацаваную Мусоліні „Хартыю (Канстытуцыю) Працы“, як назвала прэса гэты сумбурны праект дзяржаўнай рэгляментацыі ўзаемных ад осінаў між работнікамі і працадаўцамі. Мусоліні гучна назваў свой твор — „Канстытуцыяй ці арганізацыяй корпарацыйнага (прафэсіянальнага) гаспадарства“.

Разграміўшы ўсе вольныя клясавыя работніцкія арганізацыі, фашыстоўскі ўрад, які зьяўляецца экспазытурай ваяўнічай імпэрыялістычнай буйнейшай буржуазіі, пачуў патрэбу стварыць нейкую сумольную „ідэалёгію“, якая-б „лучыла інтарэсы работнікаў і працадаўцаў у адно агзінае цэлае“, — а па сутнасьці—пад гучнай фразай хавала-б для наіўных **фактычную дыктатуру прамыслоўца ды абшарніка.**

Дзеля таго І пункт гэтай „Канстытуцыі Працы“ кажа:

„Нацыя ёсьць арганізм, які мае вышэйшыя ды важнейшыя жыцьцёвыя задачы ды вялікшыя срэдствы дзеяльнасьці, як паасобныя групы ці асобы, з якіх нацыя складаецца. Нацыя ёсьць маральнае, палітычнае і гаспадарчае адзінства, цалком уасобленае ў фашыстаўскім гаспадарстве"... А фашыстаўскае гаспадарства ўасоблена ў фашыстаўскім урадзе, галава якога—Мусоліні; дык фашыстаўскае гаспадарства гэта—асоба Мусоліні, які за грошы буйнейшых банкіраў і прамыслоўцаў зрабіў пераварот ды прадаўжае служыць выключна ім.

Далей у „Хартыі Працы" ідуць гучныя, але чыста дэклярацыйныя, заявы аб „абавязках Працы і капіталу", аб праве гаспадарства рэгуляваць іх узаемныя адносіны, аб нормах платы, аб „вольных умовах" між работнікам і працадаўцамі—пад кантролем пануючае неабмяжованае буржуазіі...

Трайны саюз.

Англійскае міністэрства замежных спраў падае афіцыяльна вестку аб тым, што ў блізкім часе мае быць заключаны спэцыяльны саюз між **Англіяй, Амэрыкай і Францыяй**, які мае мэтай — супольную палітычную акцыю гэтых дзяржаваў па за **Лігай Народаў**.

Асаблівую ўвагу новы „трайны саюз" мае зьвярнуць на Балканы, Паўночную Афрыку і Далёкі Усход.

Праца над гэтым саюзам ужо настолькі пасунулася наперад, што ў часе бытнасьці прэзыдэнта Францыі з Брыянам у Лёндане (маюць выехаць неўзабаве) ён будзе ўжо падпісаны.

Гэткім чынам робіцца спроба стварыць **сусьветную дыктатуру** трох наймагутнейшых дзяржаваў. І гэта — пры „істнаваньні" Лігі Народаў!

У Нямеччыне вестка аб заключэньні „трайнога саюзу" Англіі, Амэрыкі і Францыі выклікала вялікую трывогу. Нямецкія газэты пішуць, што можа англійскае агенцтва крыху „падкруціла" тое, што мо' яшчэ толькі мае зрабіцца. Бо-ж, калі праўда, што гэткі „саюз" **ужо гатовы**, дык гэта—запраўдны пераварот ува ўсей сыстэме сусьветнай палітыкі. Перадусім, гэта — канец Лігі Народаў, якую фактычна заступіць гэты „трайны саюз". Пасьля, гэты саюз мае быць скіраваны проці СССР, за якой стаіць яе саюзьніцца—Нямеччына. Дык „саюз" будзе націскаць на яе з усіх сілаў, каб разьбіць гэты саюз яе з СССР. Аб гэтым выразна нядаўна пісала адна з англійскіх газэтаў. Усё гэта павінна будзе змусіць нямецкую палітыку да вялікай асьцярожнасьці.

Такое-ж сільнае ўражаньне зрабіла англійская вестка і ў Італіі, для якой паразуменьне яе „саюзьніцы" Англіі з яе „ворагам" Францыяй — зьяўляецца таксама трывожнай неспадзяванкай.

Дзьве канстытуцыі.

У сучаснай Польшчы, якая так хваліцца сваей Канстытуцыяй 17-га сакавіка, нацыянальным сьвятам, побач з днём уваскрашэньня Польшчы пасьля векавое няволі, павінен быў-бы быць якраз — дзень 17-га сакавіка. Але чамусьці польскае буржуазнае грамадзянства выбрала сабе за адзінае, ці галоўнае нацыянальнае сьвята—дзень аб'вяшчэньня Канстытуцыі 3 га траўня аж 1791 г.

Дзень аб'вяшчэньня гэтае старое Канстытуцыі стаўся для сучаснай буржуазнай Польшчы такім-жа першым сьвятам „народу", як дзень збурэньня Бастыліі (вялізарная каралеўская турма для палітычных вязьняў у Парыжу) для сучаснай Францыі, як дзень вызваленьня з пад аўстрыяцкага ярма для Італіі, як дзень залажэньня ці здабыцьця незалежнасьці для цэлага раду іншых дзяржаў. Дык само-сабой узьнімаецца пытаньне: што-ж такое дала Польшчы, ці польскаму народу, гэная колішняя Канстытуцыя?

Перадусім трэба адзначыць, што Канстытуцыя 3-га траўня, апрацаваная больш лібэральнай шляхтай — у згодзе з найбагацейшай буржуазіяй і аб'вешчаная ў 1791 г., **ніколі ня была ўведзена ў жыцьцё**. Палажэньне, у якім апынулася ў тыя часы Польшча, магло адратаваць мо' адно толькі **ўсенароднае выступленьне — рэвалюцыя**. Гэткая магутная рэвалюцыя якраз і адбывалася тады ў прыязнай да Польшчы Францыі, але якраз гэтага ўсемагутная польская шляхта баялася тады больш, чым зялезнае рукі расейскай Кацярыны II. Але і аб гэную Канстытуцыю, не ўвайшоўшую ў жыцьцё, пачаліся ўраз-жа спрэчкі ды змовы („канфэдэрацыі") проці яе. Магнаты разам з каталіцкім духавенствам зрабілі ліхое памяці „таргавіцкую канфэдэрацыю", на чале якой стануў сам кароль. Гэтая „Таргавіца" была моцна падтрымана... Кацярынай II ды Фрыдрыхам Прускім, у выніку чаго пасьля 2 гадоў хатняй вайны **Канстытуцыя 3 га траўня была скасавана**. Пасьля гэтага аб ёй—у завастрыўшайся барацьбе — навет і не ўспаміналі. Ад былое Рэчыпаспалітае асталася тады ўжо толькі чацьвёртая частка: рэшта была падзелена паміж Расеяй, Прусіяй ды Аўстрыяй. А ў гэтай чвертцы запраўдныя барацьбіты за волю Польшчы—на чале з Касьцюшкай—аб'вясьцілі другую Канстытуцыю — рэспубліканскую, дэмакратычную, якое сучасная Польшча чаму сьціне сьвяткуе... Гэтая новая Канстытуцыя мела на мэце—падняць на абарону дзяржавы працоўныя масы, а перадусім—сялянства, аб якім толькі цяпер успомнілі паны шляхта ды буржуазія. Але ўспомнілі залішне позна: народ — сялянства, страшэнна стагнаўшае пад **паншчынай, якую пакінула нятыкальнай Канстытуцыя 3 га траўня** не пайшоў бараніць паноў—навет у войску Касьцюшкі, армія якога і была разгромлена расейцамі. А зараз-жа пасьля паражэньня Касьцюшкі быў зроблены апошні падзел Польшчы, якая перастала істнаваць зусім, як незалежная дзяржава.

Цяпер пабачым у кароткім аглядзе, што ж зьмяшчала ў сябе гэная слаўная цяпер у Польшчы Канстытуцыя 3-га траўня, які агульны характар мела яна. Гэтая Канстытуцыя была **кампрамісам сярэдня заможнай шляхты з багацейшай мястовай буржуазіяй**; гэта быў саюз, **скіраваны аднолькава проці найбуйнейшага „анархічнага" абшарніцтва-магнатаў, як і проці ўсяго прыгоннага сялянства, складаўшага вялізарную большасьць насяленьня краю**. Як мы сказалі ўжо, **паншчына была захавана цалком гэтай слаўнай Канстытуцыяй**, якой цяпер так захопліваецца амаль ня ўсё польскае грамадзянства сучаснай Дэмакратычнай Распублікі.

Але мала гэтага: Канстытуцыя 3-га траўня, якую сучасная рэспубліканская Польшча шануе ды цэніць вышэй за сваю новую Канстытуцыю 17-га сакавіка, — **ня толькі пакідала караля ў старой шляхоцкай „Рэспубліцы", але яшчэ далей узмацоўвала яго ўладу, робячы караля—ня выбарным, але насьледным**. А выяўленьнем кампрамісу з мястовай буржуазіяй (мяшчанствам), якая да таго часу ня мела ў шляхоцкай Польшчы ніякіх палітычных правоў, было **дапушчэньне ў Сойм паслоў і ад мяшчанства**, ды яшчэ рад дробных уступак на карысьць гэтае клясы.

Паслухайце, як далікатна кажа аб гэтым адзін з сучасных паклоньнікаў Канстытуцыі 3-га траўня, захопліваючыся яе „патрыятызмам, вялікім палітычным рэалізмам і цьвярозасьцяй". Ен адкрыта кажа, што „тварцы гэтай Канстытуцыі абмежыліся сьведама ды мэтна вельмі скромнымі рэформамі". Чаму? А затым, што польскае мяшчанства ня было такім асьвечаным ды багатым, як францускае, а польскае сялянства... **„не паліла панскіх палацаў, што так сільна заважыла на (радыкальнейшых) пастановах францускага рэвалюцыйнага парляманту". Дзеля таго сялянства і не здабыла тады сабе правоў, паны не скасавалі паншчыны ў створанай імі**—у згодзе толькі і выключна з мястовай буржуазіяй—Канстытуцыі 3 га траўня. А піша гэта з поўнай шчырасьцяй адзін з выразна правіцовых органаў — „Кур. Варш." (№ 120, 3-га траўня). Аўтар артыкулу, даволі ведамы п. Токаж, сьцьвярджае, што, ня гледзячы на гэтую сваю „скромнасьць", Канстытуцыя 3-га траўня зрабіла „вельмі важныя рэчы": „мяшчанскую справу ўрэгулявала так, што поўнае раўнапраўе мяшчанства рабілася толькі... пытаньнем часу". „Справу сялянскую высунула ў такім відзе, што падрыхтавала грунт пад... будучае скасаваньне рабства" (паншчыны). Вось і ўсё....

Сам гэты аўтар у канцы, аднак, слушна сьцьвярджае ўсю палітычную „слабасьць" тварцоў гэнай Канстыцуцыі, якія ня здолелі сваімі „скромнымі" рэформамі захапіць яшчэ істнаваўшыя тады жывыя сілы краю, ды падняць іх на абарону свае дзяржавы. І ня дзіва: бо-ж гэныя сялянскія масы, якія надалей былі засуджаны на паднявольнае жыцьцё, ня лічылі дзяржавай. А калі прыйшоў час касьцюшкаўскай дэмакратычна-рэспубліканскай дэклярацыі, дык было ўжо позна.

Характэрна, што ўсё амаль польскае грамадзянства ня толькі не хавае, але наадварот — гучна ды ўрачыста **падчырківае** сваю любоў і пашану да гэтай старой манархічнай, прыгоннай Канстытуцыі, хаця мае—прынамся на паперы—другую, новую—рэспубліканска-дэмакратычную. Гэты факт бясспрэчна сьведчыць аб тым, што **запраўдная душа польскага грамадзянства жывець ня ў творы 17-га сакавіка 1921 г., які, асабліва ў апошнія часы, так пагардліва трактуецца амаль ня ўсімі палякамі ў Польшчы, але якраз — у творы 3-га траўня 1791 году.**

Праўда, „твор 17-га сакавіка" страшэнна абурае патрыятычную польскую душу, паміж іншым, і тым, што ён—**ня вольны**, але ў значнай меры—**„накінены гвалтам"** саюзьнікамі-пераможцамі ў Вэрсалі. Як ведама, у Канстытуцыю 17-га сакавіка паводле Трактату з 28-га чэрвеня 1919 г., былі ўведзены прымусова ўсе параграфы, якія гарантуюць правы няпольскага насяленьня. Дык, апрача ўсяго іншага, так салодка хаця раз у год „адвясьці душу", як кажуць расейцы, на лятуценьні аб слаўнай Канстытуцыі 1791 г.

Дзьве Канстытуцыі, адна побач з аднэй, жывуць і дзеюць у сучаснай Польшчы. Адна, якая „абязывае", — накіненая, нямілая, няпрыемная, крыўдная, раўнуючая пана-магната, з „хлопам" і багатыра-фабрыканта з голым ды брудным рабачаем,—**раўнаючая польскага пана з беларускім ці ўкраінскім хлопам, каталіка — з жыдом!..** Другая Канстытуцыя—любая, старая, стары „духовы нацыянальны скарб", з якім зжыліся цэлыя ў часы няволі пакаленьні палякоў, столькі гадоў лятуцеўшыя аб тым, каб нарэшце ўзнавіць у „сваей уласнай дзяржаве" гэтую палітычную ды сацыяльную ідэалёгію XVIII сталецьця!.. Дык ня дзіва, што з абедзьвюх Канстытуцыяў старая ніяк ня хоча выйсьці з польскай душы, а новая ніяк ня можа зрэалізавацца.

У заключэньне—некалькі слоў аб адносінах да Канстытуцыі 3 га траўня „няпольскай Польшчы", а перадусім яе тэрыторыяльных меншасьцяў. Беларусы і ўкраінцы маюць яшчэ і сваю асаблівую прычыну адносіцца, што-найменш, холадна да сьвяткаваньня яе.

Справа ў тым, што ў гэнай Канстытуцыі 3 га траўня 1791 г. **першы раз было абвешчана поўнае дзяржаўнае адзінства ўсіх зямель**, якія датуль уваходзілі ў склад Рэчыпаспалітай на правах саюзу, або ўніі, ня губляючы зусім сваей дзяржаўнай самастойнасьці ды поўнай незалежнасьці. Гэткім чынам, напрыклад, да гэнае Канстытуцыі наша Беларусь ці Літва **не „належылі" да Польшчы**, але, ствараючы асобную дзяржаву, былі дынастычна—праз караля — аб'яднаны з Польшчай у адзін саюз. І вось Канстытуцыя 3-га траўня аб'явсьціла бязумоўнай, непадзельнай часткай Польшчы, яе „ўласнасьцю"—усе гэтыя дзяржаўна-самастойныя краіны, якія былі ў вольным саюзе з ей. Пры гэтым аб'вяшчэньне гэта было зроблена аднабока бяз згоды законнага прадстаўніцтва гэтых краін дый у той мамэнт, калі ўжо значная частка іх адыйшла па першаму падзелу Польшчы да другое дзяржавы... Ня гледзячы на гэта, ня гледзячы на скасаваньне гэнае Канстытуцыі ў 1793 годзе, — польскае грамадзянства лічыць пастанову яе за **праўную падставу для свайго „тытулу ўласнасьці" на ўсе землі былага „Вялікага Княства Літоўскага"**.

Вось у гэтым—яшчэ адна прычына асаблівай любові ды пашаны польскага грамадзянства да гэтай старой імпэрыялістычнай канстытуцыі, створанай польскай шляхтай XVIII веку. **Кандратовіч.**

Варшава 3-га траўня.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Ізноў—„сэсія камісіі рэчазнаўцаў".

9 траўня мае распачацца ізноў колькідзённая сэсія слаўнай сваей імпотэнтнасьцяй (бясcільлем) „камісіі рэчазнаўцаў у справах нацыянальных меншасьцяў". Камісія зьбярэцца, каб ізноў перагледзець—няведама ўжо, каторы раз,—істнуючыя заканадаўчыя абмяжаваньні для нацыянальных меншасьцяў, а перадусім для жыдоў — абмяжаваньні, якія-ну, ведама-ж, асталіся, як агідная спадчына па „заборцах", але ад якой польская ўлада чым-хутчэй хоча — шчыра, ахвярна ды згодна з Канстытуцыяй—вызваліцца...

Камісія, якая, пасьля выхаду п. Голубкі, складаецца толькі з 2 сяброў (абодва пэпэсы), мае выбраць сабе трэцяга, прадставіўшы яго, як кандыдата, на зацьвярджэньне ўраду.

Ці будзе прыпынена падвышка кватэрнай платы?

Газэты пішуць, быццам Рада Міністраў надумываецца, ці прыпыніць крыўдныя для вялізарнай масы бедных кватэрантаў, але карысныя для дамаўласьнікаў, падвышкі да кватэрнай платы—па падставе дэкрэту ў справе аховы—вось, каго больш, дык няведама ці „лёкатараў", ці якраз — дамаўласьнікаў... Быццам ня толькі 1-пакаёвыя, але і 2-пакаёвыя кватэры маюць быць зволынены ад дадаткаў.

Выключэньне пасла Гэльмана.

Пасол Гэльман пастанаўленьнем Клюбу ды Галоўнай Управы выключаны з польскай „Сялянскай Партыі" (брылёўцы).

Заграніцай.

1 траўня ў Эўропе.

Дзень 1 траўня ў Югаславіі, Швайцарыі, Румыніі, Англіі, Францыі і Латвіі прайшоў без усялякіх канфліктаў ды сутычак. Толькі ў Рызе фашысты падлажылі маніфэстантам бомбу, якую аднак і дагледзілі і пасьпелі забраць да выбуху.

Маёвая адозва Комінтэрну.

Першамайскі маніфэст Комінтэрну га-

Новы солтыс.

(*Нарыс з натуры*).

Мурзатыя і абдзёртыя сяляне, большасьцю босыя, у белых кужэльных портках і такіх самых белых кашулях, ад самага раньня тапталі ўжо перад вокнам „старога" солтыса крывую вуліцу і гудзелі, як шмялі.

— „Не, суседзі, так далей быць ня можа. Солтыс павінен быць наш чалавек, а не якісь там панскі падліза"!.. крычаў высокі, як шост, худы Якім.

— „Поўна цяпер-жа раўнапраўе, дык чаму мы маем быць горшыя за каго"?!... адказаў яму васпаваты храмы Бладысь.

— „Адылі, ато-што, яны праўду кажуць. Цяпер мы мусім выбраць за старасту свайго чалавека, ня гэткага п'яніцу, як гэны Кіндзюк, што за чарку гарэлкі і смачную папяросу ліжацца пану, ажно глядзець брыдка"— сцьвярдзіў іхнюю гаворку курносы шыракаплечы стары Міхась і, набіўшы самасейкай люльку, пачаў яе прыкураваць ад суседавай цыгаркі.

— „Што і гаварыць, такога гада, ак Антон мусіць і ў пекле ня будзе болей. Помніце, як ён пры перaглядзе коні ўсе двары без чаргі з самага раньня прапусьціў, а нас здяржаў да поўночы"...

— „І гэта ў самую сяўбу"... дакінуў хтосьці.

— „А помніце, як гэта выйшоў загад дарогі акопаваць? Колькі ён тады на нашых сялянскіх нівах зглуміў жыта і ярыны, адразаючы нібы-то патрэбную шырыню дарогі; а як дайшлі да панскага поля, — дарога адразу павузела"... — гаманіў іншы.

І пайшло пералічваньне грахоў „старога" солтыса: прыпомнілі дарогу, прыпомнілі камяні, падводы па дрэвы, соймікавыя шараваркі, шараваркі касьцельныя, школьныя і т. д. і т. д., а грахі ня толькі не канчаліся, а, не мяркуючы, як з бяздоннага мяшка, вылазілі ўсё новыя і новыя.

Сяляне чакалі і гаманілі, сонца паднімалася ўсё вышэй і вышэй і пачынала падбірацца ўжо к паўдню, а назначаныя на восьмую гадзіну выбары ўсё не пачыналіся.

— „Дакуль-жа мы тут так таўчыся будзем?... Сказалі выбары будуць а гадзіне сёмай, а тут ужо скора і паўдня пройдзе" прагаварыў наастатку хтосьці.

— „Адылі, ато-што, праўду ён кажа, — чаго мы тут так доўга маем тырчэць?... Трэба рабіць хутчэй выбары, дый да хаты", — прагаварыў зноў стары Міхал, ня вымаючы з роту люлькі.

— „Выбіраць — лёгка сказаць выбіраць, а як ты гэта зробіш, калі войт у воласьць яшчэ ня прыехаў"... — жаліўся хтось на начальства.

— „А чаму гэта з Жукоў ніхто не зьявіўся?...

— „А хто іх ведае — паляніліся можа, а можа ніхто не наказаў"?...

— „Маглі аб выбарах у Жукі і не наказаць... Нам і то наказалі толькі ўчора вечарам, а мы што — адгэтуль паўвярсты".

— „Добра вам жаліцца, вам усёткі наказалі ўчора, а мы проста сягоньня прыпадкова даведаліся, што будуць выбары; падумалі сабе, дай, пойдзем паглядзім, што гэта за выбары будуць. Ну і прыйшлі".

— „А дзе ж вашых балей"?...

— „Дома засталіся".

— „Чаму-ж ня прыйшлі сюды"?

— „Ня верылі, што выбары будуць. Кажуць, што калі-б ды былі назначаны выбары, то ўсім-бы наказалі, а якія гэта выбары, калі аб іх ніхто ня ведае"?

— „А можа і запраўды выбараў сягоньня ня будзе?... Гэта-ж ужо каторая пара на дварэ... Гляньце, дзе ўжо сонца"?.

— „Трэба запытацца ў солтыса — а то, што мы запраўды топчамся тут, як дурныя".

Пайшлі ў хату да солтыса, але солтыса дома не знайшлі. Ен яшчэ з самага раньня, як толькі прывялі коні з начлегу, паехаў у воласьць па войта. Меўся вярнуцца на гадзіну восьмую з начальствам, але чамусьці дамоў не вярнуўся і да гэтага часу.

Сяляне ўжо даўно патопаліся, пагалдзеліся асудзілі і перасудзілі ўсё сваё начальства, пасьпелі і есьць захацець, а „стары" солтыс ня толькі ня вёз войта, але і сам дамоў не варачаўся. Рашылі ўсе, што выбараў напэўна ў гэты дзень ня будзе, і, пачакаўшы дзеля пэўнасьці яшчэ з гадзіну, пачалі патроху расхадзіцца дамоў.

Раптам у канцы вёскі забрахалі сабакі, а за імі скора па камянёх вуліцы затарарахталі калёсы.

— „Едуць солтыс з войтам і яшчэ якісь пан"!... крыкнулі дзеці.

— „А што, бачыце? Я-ж такі казаў, што сягоньня выбары"... прагаварыў хтосьці.

Тымчасам калёсы параўняліся з сялянамі. На першым вазе „стары" солтыс вёз валаснога пісара, а на другім ехаў войт з асаднікам Пажэрскім.

Начальства ўсё-ж такі начальства, і сяляне, даючы дарогу, адступіліся назад і прыпаднялі шапкі.

— „Эй, вы, — чаго вы там стаіцё, як вароны"... крыкнуў раптам солтыс. „Адчыняйце вароты"!...

Вароты з скрыпам адчыніліся, прапускаючы абедзьве фурманкі на двор.

— „Каня не адпрагайце, бо я мушу зараз-жа ехаць далей", — заявіў тоўсты, быццам кормны кабан, войт, вылазючы з калёс.

— „Калі ласка, пане войце, у хату", — запрашаў солтыс сваё начальства. — „І вы, паночку, таксама. Коні дагледзіць мой хлапец... Або ты, Іван, не чакаючы доўга, прывяжы тут коні, ды паглядзі іх"... — зьвярнуўся ён да аднаго з выбаршчыкаў.

— „Дык, пане войце, скарэй рабеце гэтыя выбары ды і едзем, бо там на нас ужо напэўна даўно чакаюць"... — прагаварыў, чмыхаючы носам, асаднік, як толькі яны зьлезьлі з воза.

— „У момант, пане Пажэрскі, усё будзе гатова", — адказаў яму пісар, дастаючы якіясь паперы і раскладаючы іх на вынесеным з хаты стале. „Пане войце, пачынайце".

— „Згодна з распараджэньнем пана старасты, сягоньня адбудуцца ў вашай грамадзе перавыбары солтыса", — пачаў гаварыць войт. „У гэтых перавыбарах нароўні з вамі мае голас і пан Пажэрскі, які сёлета дастаў тут асаду. Солтыс, як ведама, павінен быць чалавек граматны, у ніякай палітыцы не замешаны і да такой адказнай працы здольны. Найлепшым з-паміж вас з гэтага пагляду і ёсьць ваш стары солтыс. Радзіў-бы вам ізноў яго выбраць за солтыса, ведама, калі ён на гэта згодзіцца. Аднак, можа-це, калі вам хочацца, выбраць і кагось іншага".

— „Каб не зацягаваць выбары, назы-

лоўную ўвагу зьвяртае на кітайскія здарэньні. Адозва вінавацiць імпэрыялістычныя дзяржавы ў тым, што яны, вядучы вайну з кітайскім народам, тым самым падрыхтоўваюць у будучыні новую вялізарную сусьветную вайну. Адозва заклікае ўсе каляніяльныя народы да падрыхтоўкі сусьветнай рэвалюцыі.

Міжнародавая Гаспадарчая Канфэрэнцыя.

4 траўня распачалася ў Жэнэве Міжнародавая Гаспадарчая Канфэрэнцыя.

Камунікат латвійскага і эстонскага міністраў.

У Рызе адбылася канфэрэнцыя латвійскага міністра заграничных спраў з эстонскім, у выніку якой абодва міністры выдалі афіцыяльны камунікат, сцьвярджаючы поўную згоду абодвух урадаў у іх замежнай палітыцы. Як ведама, неабходнасьць паразуменьня была выклікана пэўнымі розьніцамі ў палітыцы абодвух краёў адносна да—СССР.

Тэрор у Літве.

Ковенскі ваенны суд разглядаў яшчэ адну справу — аб паўстаньні ды замаху на істнуючы „лад" у Літве. На лаве падсудных 14 асоб—вайсковых, чынных ці запасных, ды цывільных. 7 засуджаны ў катаргу—ад 4 аж да 20 гадоў, паміж імі толькі 2 вайсковых.

Першамайскі прыказ па арміі Ворошылова.

Ворошылов выдаў 1-га траўня прыказ па арміі, у якім кажа, што пагроза вайны, ня гледзячы на міралюбства Радавага ўраду, ня счэзла. Чырвоная армія павінна надалей стаяць на старожы Радавага Саюзу. У гэтым годзе ўрад зьверне асаблівую ўвагу на тэхнічную падрыхтоўку арміі СССР, якая павінна стацца—першай у сьвеце.

Даклад аб гаспадарчым разьціцьці СССР.

На зьезьдзе Радаў СССР з вялікім дакладам аб гаспадарчым стане СССР выступіў старшыня Рады Народнай Гаспадаркі, Куйбышев. Радам лічбаў дакладчык даводзіў, што прамысловасьць СССР ня толькі ўжо дасягнула даваеннага роўня, але навет на 8—10 проц. перавысіла яго. Асаблівыя пасьпехі дакладчык адзначыў у галіне вырабу машынаў, якога амаль-што зусім ня было да вайны. За апошні год калясальна павялічылася дабываньне вугальля, так-што ў хуткім часе СССР будзе абыходзіцца зусім без падвозу замежнага вугальля. Вельмі значны поступ адзначыў дакладчык у дабываньні нафты, якая — дзякуючы сваей найлепшай без параўнаньня якасьці, — можа цяпер канкураваць на сусьветным рынку навет з амэрыканскай.

У заключэньне дакладчык сцьвярдзіў, што ўсімі гэтымі дасягненьнямі сваей гаспадаркі можа слушна гардзіцца радавы пралетарыят.

Бухарын заклікае Індыю да паўстаньня.

На зборы слухачоў „усходня-камуністычнага ўнівэрсытэту" у Маскве Бухарын сказаў прамову, у якой асьвятліў абраз рэвалюцыйна-нацыянальнага ўздыму ў Азіі — проці эўрапэйскіх імпэрыялістаў, а перадусім—проці Англіі.

„Для паняволеных народаў Індыі цяпер ствараюцца выгадныя абставіны дзеля рашучай барацьбы проці эксплёатуючага іх англійскага капіталу. Дык, калі рэвалюцыйныя партыі Індыі згары падрыхтаваліся да гэтай цяжкай барацьбы і маюць срэдствы дзеля хуткага выпаўненьня задачы, — тады ім забясьпечана перамога. Бо мамэнт дае вынятковую нагоду для перамогі. Але, калі выкананьне рэвалюцыйнага пляну зацягнецца, тады ўся акцыя зьвядзецца пакуль-што толькі да бескарыснага праліцьця крыві. Тады далейшая барацьба будзе значна больш цяжкая: бо англійскі капіталізм знойдзе падтрыманьне сярод сваіх „сацыялістаў" ды выступіць з вялізарнай адпорнай сілай. Але адначасная барацьба на кітайскім, эгіпецкім ды іншых каляніяльных фронтах і дапамога вызваленьню англійскіх каляніяльных народаў з боку ўсяго пралетарыяту Азіі і Эўропы — могуць даць бліскучую перамогу вызваленьню Індыі".

Хатняя вайна ў Кітаі.

З лёндаскіх (няпэўных) крыніцаў паведамляюць, быццам Ханькоў заняты войскам Чанг-Тсо-Ліна (можа—Чанг-Кай-Шэка?).

Аканчальнае разьбіцьце супольнай акцыі дзяржаваў у Кітаі?

З Шанхаю — праз Лёндан — паведамляюць, што ў найбліжэйшым часе распачнуцца перагаворы Чанг-Кай-Шэка з паасобнымі дзяржавамі, што мае азначаць аканчальнае разьбіцьце супольнай акцыі дзяржаваў у Кітаі. Амэрыканскі ўрад быццам ужо гэткія перагаворы распачаў.

Барацьба за права на забастоўку.

У англійскім парляманьце распачалася дыскусія аб законапраекце рэакцыйнага ўраду, каб забараніць ці абмежыць права работнікаў на забастоўку. Як ведама, урадавы праект лічыць зусім недапусьцімай агульную забастоўку з мэтай палітычнага націску на ўрад. Выступаюць найлепшыя парляманцкія сілы—з абодвух бакоў. Барацьба ў парляманьце ўсё завастраецца. Аднак-жа англійскія „пэпэсы" рашуча правалілі прапазіцыю больш левых сацыялістычных арганізацыяў—падтрымаць парляманцкую барацьбу новым рашучым выступленьнем пралетарыяту — якраз у форме тэй самай агульнай забастоўкі, якую буржуазны ўрад хоча скасаваць назаўсёды, выбіўшы гэтае магутнае аружжа барацьбы з рук работнікаў.

„Перамусолініў".

У сваім імкненьні акружыць Югаславію сьцяной сваіх прыхільнікаў і саюзьнікаў, каб зрабіць яе бяссільнай да адпору, Мусоліні „згарача" нарабіў рэчаў, якія цяпер павінны памсьціцца на ўсей яго залішне пасьпешнай працы.

Як ведама, зрабіўшы трактат прыязьні з Румыніяй — дзеля выкарыстаньня яе проці Югаславіі, Мусоліні гэтым амаль-што не разьбіў Малую Антанту: Югаславія страшэнна заелася на свайго таварыша па гэтай Антаньце—Румынію.

Але Мусоліні пайшоў яшчэ далей: яму вельмі патрэбна яшчэ прыязьнь і Вэнгрыі, дык ён і з ёй зрабіў яшчэ больш „сардэчны саюз" (ведама-ж: абодва ўрады—захватніцка-фашыстаўскія). Але ж Вэнгрыя ня мае больш заклятага ворага, як Румынія, якая ўваходзіць у склад Малай Антанты, створанае фактычна ўжо ў Вэрсалі пераможцамі, каб мець „жандара" над Баўгарыяй, Аўстрыяй і Вэнгрыяй. Дык, калі вэнгерскі прэм'ер праф. Бэтлен прыехаў у Рым дзеля падпісу „трактату прыязьні", а Мусоліні пачаў казаць яму ды Вэнгрыі розныя пекныя камплімэнты,—у Румыніі новыя прыяцелі Італіі страшэнна ўзбурыліся. Асабліва абурыла румынскае грамадзянства прамова Мусоліні, у якой той выхваляе вэнгерскую армію — у яе вайне з Румыніяй у 1919 г., прыпамінаючы Вэнгрыі тыя ўслугі, якія тады быццам аказала ей Італія.

Выкрыцьце вялізарнай бандыцкай ці анархістычнай арганізацыі ў Парыжу.

Парыжская паліцыя выкрыла шырака разгалінёную свайго роду „рэвалюцыйную" арганізацыю, у склад якой уваходзілі... паўтары тысячы міжнародных праступнікаў, пераважна італьянцаў і гішпанцаў! Арганізаныя гэтая фінансавала розныя анархістычныя выдавецтвы грашмі, здабываньмі шляхам бандыцкіх нападаў ды грабежстваў. Арганізацыя быццам мела запасы аружжа, паміж іншым 3.200 бомбаў, з якіх знойдзена 600.

Хадэцка-сельсаюзьніцкая інтрыга.

Пасьля арыштаў грамадаўскіх і блізкіх да „Грамады" беларускіх дзеячоў хадэцка-сельсаюзьніцкія павадыры ўгледзілі чамусьці ў асобе грам. Антона Луцкевіча адзінага ўжо небясьпечнага для сябе ідэйнага працўніка, якога на груньце ідэйным разьбіць яны былі ня ў сілах. Дык вось на страніцах іхніх газэт—„Сялянскае Нівы" і „Беларускае Крыніцы"—проці яго і быў распачаты агідны паход. Ілжа, выліваньне ўсялякіх брудаў і лаянка, якімі займаліся раней яўна-дэфэнзыўныя газэты („Грамадзкі Голас", „Беларускае Слова"), сталіся спэцыяльнасьцяй сельсаюзьніцкае і хадэцкае прэсы. Галоўным спэцыялістам у гэтым кірунку аказаўся кс. Адам Станкевіч, адно з апошніх выступленьняў якога падаем ніжэй, пакідаючы нашым чытачом ацэнку маральнае вартасьці і гэтага выступленьня, і аўтара яго.

Месяцы два назад хадэцка-сельсаюзьніцкія павадыры надумалі і выпаўнілі новы агідны напад на грам. Луцкевіча. „Сялянская Ніва" абвясьціла, што яна „выкрыла", быццам інфармацыі для пасла Воевудзкага аб беларускіх паслох для... дэфэнзывы, дый яшчэ за грошы! — даваў грам. Луцкевіч. Гэтая сьвядомая ілжа была цалком разьбіта надрукаваным у аднаднёўцы „Водклік" пісьмом грам. Сьвяневіча, які сцьвярдзіў, што рэфэраты аб беларусах, падаваныя праз грам. Воевудзкага, пісаў ён, Сьвяневіч, за два гады да хвіліны, калі першы раз сустрэўся і пазнаёміўся з грам. Луцкевічам.

Бачачы, што такім фактычным матэрыялам іх ілжа і злая воля аканчальна раскрыты, хадэцка-сельсаюзьніцкія павадыры хапіліся за апошнюю, на іх пагляд, дошку ратунку,—і вось „сам" кс. Ад. Станкевіч у № 13 „Беларускае Крыніцы" з 25 сакавіка с. г. ўлажыў гэнную-ж ілжу ў вусны грам. Плаўскага, пасла Сойму (ад П. П. С.), — у такіх славах:

„Як месяц таму пасол інж. Плаўскі (ППС) у вагоне падчас нашай падарожы ў Варшаву, у прысутнасьці пасла палкоўніка Вэндзягольскага, пасла Ярэміча і маей, ня робячы з гэтага ніякага сэкрэту, казаў: ёсьць чуткі, што весткі для Воевудзкага аб беларусах былі ў Вільні зьбіраны, між іншым, пры помачы п. А. Луцкевіча. Ці ў гэтай гутарцы ўспаміналася прозьвішча п. Сьвяневіча,—ня помню".

На падставе гэтага пісьма грам. Луцкевіч, разумеючы, што тут справа—нячыстая, папрасіў зьвярнуцца да пасла Плаўскага двух сваіх паўнамочнікаў — грамадзян інж. Трэпку (дырэктара Віл. Бел. Гімназіі) і М. Марцінчыка, якія сваю гутарку з гр. Плаўскім запратаколілі. Гр. Плаўскі катэгарычна запярэчыў заявам кс. Станкевіча. Мала таго: як відаць, пасол Плаўскі рашуча запратэставаў перад кс. Станкевічам проці нягоднага ўжыцьця ягонага, гр. Плаўскага, імя дзеля прыкрыцьця звычайнага машэнства. Бо-ж у № 17 „Бел. Крыніцы" з 22 красавіка зьявілася наступнае пісьмо таго-ж кс. Ад. Станкевіча, у якім ён мусіў прызнацца, што **ў папярэднім сваім пісьме нягодна налгаў!** Вось гэтае пісьмо:

„З прычыны майго пісьма, надрукаванага ў „Бел. Крыніцы" ў № 13 з 25.III 27 году, вытлумачваю, што гутарка п. пасла Плаўскага ў вагоне, на якую я паклікауся, як аказалася, тычыла перадусім п. Сьвяневіча і яго адносінаў да п. Воевуззкага.

„У гэтай-жа гутарцы ўспамінаўся і п. Луцкевіч, як адзін з тых беларускіх палітыкаў, каторыя паводле пагалосак былі ў палітычных зносінах з п. Сьвяневічам"

Падпісана: кс. Ад. Станкевіч.

Гэтым пісьмом аканчальна разьбіваецца агідная інтрыга кс. Станкевіча і Ярэміча, які выкарыстаў яе ўраз-жа ў сваей „Сял. Ніве". Характэрна, што кс. Станкевіч у апошнім сваім пісьме хоча ўсё-ж пакінуць уражаньне, быццам аб грам. Луцкевічу гаварылі паслы-палякі. Апёкшыся на грам. Плаўскім, якому перш гэта прыпісаў, ён ужо не адважаецца зрабіць тое-ж з паслом Вэндзягольскім, які таксама ня дасьць пэўне спуску брахуну — ды піша, быццам у гутарцы ў вагоне ўсё ж аб гр. Луцкевічу „ўспаміналася". Адкінуўшы паслоў Плаўскага і Вэндзягольскага, выходзіць, што ўсю гэную агідную ілжу выдумалі самі кс. Станкевіч і Ярэміч!

Хай-жа беларускія працоўныя масы, хай усе чэсныя людзі наагул ведаюць, хто такія павадыры хадэкаў і сельсаюзьнікаў, ды які маральны бруд разводзяць яны ў грамадзянстве.

ХРОНІКА.

Суд над „33". 4 мая ў віл. акр. судзе распачалася справа „33". Усё гэта—беларусы, пераважна сяляне, з Наваградчыны, якіх вінавацяць у тым, што быццам яны тварылі дывэрсыйныя банды, рабілі напады на поезды, нішчылі тэлефоны і тэлеграфы, укрывалі аружжа і г. д.—усё з мэтай развалу Польскае дзяржавы. Павадырамі гэных нібы-то бандаў былі—паводле абвіненьня — Ян Макоўскі, Браніслаў Яновіч, Язэп Брышко, Сьцяпан Кутаж і інш. Да гэтае-ж справы быў прычэплены і пасол Ю. Сабалеўскі, былы грамадавец, які ў апошніх часох зусім адыйшоў ад усялякае грамадзкае працы і на судзе не фігуруе...

Бароняць абвінавачаных адвакаты Андрэев, Багуцкі, Бэрэнсон, Міхневіч, Петрусэвіч, Прайс і Чэрніхов.

Справа, як звычайна, разглядаецца пры зачыненых дзьверах... Старшынствуе на судзе судзьдзя Аўсянка.

Забастоўка ткачоў у Беластоку. У беластоцкіх ткацкіх фабрыках пачалася забастоўка ткачоў з прычыны адмовы фабрыкантаў павялічыць заработную плату. Забастоўка адбываецца спакойна.

Справаздачу аб дзеяльнасьці Белар. Каап. Банку — дзеля тэхнічных прычын — зьмесьцім толькі ў наступным нумары нашае газэты.

Абяцанкі—цацанкі. Адначасна з распачатымі віленскім куратарыумам крокамі дзеля разгрому найлепш пастаўленых беларускіх гімназіяў у Вільні і Радашкавічах, б. міністар Л. Васілеўскі, галава камісіі экспэртаў да спраў нац. меншасьцяў, „пацяшае" беларусаў на страніцах газэты „Epoka", што ўрад маніцца даць усе правы аднэй з беларускіх гімназіяў і стварыць пры ёй на кошт скарбу бурсу на 100 вучняў. Як здаецца, гутарка тут ідзе аб... наваградзкай гімназіі, у якой толькі малодшыя клясы—беларускія, а ўся яна—расейская!

Той-жа п. Васілеўскі кажа, што для ўсей тэрыторыі з беларускім насяленьнем мае быць утворана адно куратарыум. Ды навет „Kur. Wil." адзначае, што ўсе гэтыя абяцанкі-цацанкі не дадуць ніякае карысьці без папярэдняе „грунтоўнае ачысткі" школьнае адміністрацыі, якая ўсё роўна ня будзе спаўняць „лібэральных" загадаў ураду...

Правы літоўскае гімназіі. Літоўская прыватная гімназія Вітаўта Вялікага ў Вільні атрымала „правы публічнасьці". Літвіны—шчасьлівейшыя за нас: нас кормяць „абяцанкамі", ды адначасна разьбіваюць тое, што мы сваей працай стварылі...

Лекцыя д-ра Дварчаніна. У гэту суботу, 7 мая, у Цэнтр. Гуртку Т-ва Белар. Школы ў Вільні (вул. Сьв. Анны 2) чарговую лекцыю чытаць будзе д-р Ігнат Дварчанін на тэму аб **найнавейшай беларускай літэратуры.**

Пачатак лекцыі — у 7 гадз. увечары. Слухачоў просяць не пазьніцца, бо лекцыя пачнецца роўна ў назначаным часе.

З увагі на тое, што аб літэратурнай творчасьці ў Усходняе Беларусі да нас даходзіць праз граніцу вельмі мала вестак, лекцыя д-ра Дварчаніна мае асаблівую цікаўнасьць.

Афіцыяльны курс грошы на 6 траўня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

6./V. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Карэспандэнцыі.

Мы хочам Беларускае Школы.

(Ваўкавыскі павет).

29 красавіка прыяжджаў у м. Сьвіслач, школьны інспэктар Ваўкавыскага павету, „badać" сялян вёскі Палонак Сьвіслацкае воласьці, злажыўшых у свой час, праз Т-ва Беларускае Школы дэклярацыі на ўрадавую беларускую школу.

Перад пачаткам справак інспэктар, відаць, для дапамогі запрасіў некалькі пэўных і „благанадзёжных" асоб. Сярод тых памоцнікоў найбольш стараўся перашкодзіць дэклярантам у іх дамаганьнях роднае беларускае школы ксёндз сьвіслацкага касьцёлу. Гэны войчынька, апіраючыся на свой аўтарытэт пастыра, угаварываў навет дамагацца расейскае школы, але толькі не беларускае, бо апошняя калечыць дзяцей, прымушаючы іх карыстацца простай, хамскай і мужыцкай мовай, бо-ж на гэтай хамскай мове, казаў ксёндз, няма ніводнай кніжкі, бо ўсе творы літэратурныя пішуцца на ўсіх мовах, толькі-ж не на беларускай. І чаго толькі не гаварыў той ксёндз—нічога не памагло. Бацькі і ўсе прысутныя на сходзе не зьвярталі ўвагі на нядобрую работу сьвіслацкага ксяндза, а некатарыя даказвалі яму, што чэхаў каля сотні гадоў таму назад, народы з захопніцкай думкай трактавалі так, як цяпер нас трактуюць, што чэская мова для захватчыкаў была „хамскай", „простай", „мужыцкай" мовай. Ды так было амаль-што з усімі адраджаючыміся народамі. А цяпер чэхі зусім самастойны народ, бо ўвесь час імкнуліся яны шляхам развою роднае культуры да незалежнасьці. Бачачы, што ксяндзоўскія пераконываньні ня ўплываюць надта на прысутных сялян — войчынька зьнік за дзьверы ў пакой, дзе інспэктар рабіў баданьні.

Пры баданьні дэклярантам стараліся падсоўваць на подпіс паперку, „якая мела сьведчыць, што бацькі ня маюць нічога супроць таго, каб у школе выкладалася польская мова. Такім чынам адна баба, неасьведоміўшыся аб сутнасьці падпісу, падпісалася, але рэшта станоўча дамагалася сваe роднае школы ў беларускай мове.

Народ Беларускі ўжо збудзіўся, ён імкнецца да асьветы, бо пераканаўся, што толькі асьвета загарантуе яму лепшае заўтра. Усе перашкоды ў імкненьні да дабрабыту ён пераможа, бо Народ Беларускі вялікі, моцны і цярплівы. Чэсьць Вам Палонкаўцы, змагары

вайцн адразу кандыдатаў", — дадаў ад сябе пісар.

— „Антон Кіндзюк" — прагаварыў бойка асаднік.

— „Далей"?

— „Юзюк Лата"

— „Міхал Юшка"

— „Андрэй Гаўрыловіч"

— „Досьць... Што вы хочаце ўсіх прысутных перапісаць, ці што"?... — перапыніў іх пісар. — „Кандыдаты, выйдзеце сюды".

Тры фігуры высунуліся ўперад. Міхал быў ужо нам знаны старык, Юзюк і Андрэй—маладыя, плячыстыя мужчыны з сьмелым паглядам.

— „Пісьменныя"?—спытаўся ў іх пісар.

— „Троху ўмеем" — адказалі яму кандыдаты.

— „Ану, расьпішыцеся"...

Сяляне пачародзе сталі расьпісывацца гражданкай пабеларуску.

— „Як гэта вы пішаце"... парускy нам ня трэба... Папольску ня ўмееце?... Ну, значыць неграматныя, і ваша кандыдатура адпадае", — прагаварыў пісар, перамігваючыся з войтам і асаднікам. „Застаецца такім парадкам толькі адна кандыдатура вашага старога солтыса Антона Кіндзюка"...

— „Пачакайце, паночку, Юзюк Лата ўмее пісаць і папольску", адазваўся ззаду.

Пісар, войт і асаднік ізноў пераглянуліся.

— „Кажаце, умее і папольску?... Добра... А колькі-ж яму гадоў?... Я нешта прыпамінаю, што яму гадоў ня больш, як дваццаць чатыры, а тут трэба, каб было ня менш, як дваццаць шэсьць", — прагаварыў ужо злосна пісар.

— „Яму ўжо дваццаць сем, ня толькі дваццаць шэсьць",—адказаў хтосьці з тлуму.

— „А пачым ты ведаеш"?...

— „Ен з нябожчыкам маім Аляксеем у адным годзе радзіўся"...

—„Ну гэта ня доказ", — перапыніў яго пісар. „А дзеля таго, што век Юзюка Латы тут на мейсцы сцьвярдзіць ня можна, кандыдатура яго адпадае. Застаецца толькі адна кандыдатура Антона Кіндзюка... Пане старшыня, з прычыны таго, што пастаўлена кандыдатура толькі аднаго Кіндзюка, можа яе і няма патрэбы галасаваць?...

— „Ясна, па-што-ж яе галасаваць, калі яна адна", — адказаў паважна старшыня, а асаднік, у знак сваей згоды, матнуў галавой.

— „Значыцца, хто за тое, што кандыдатуру Кіндзюка ня варта і галасаваць? — падніміце рукі"!.. — скамандаваў пісар.

— „За што казаў паднімаць рукі"?... — пыталіся адзін у аднаго, не зразумеўшыя нічагусенькі з апошніх слоў пісара, сяляне.

— „Каб за Кіндзюка на выбарах не галасаваць", — адказаў хтосьці, паднімаючы руку ўверх.

Усе задаволена паднялі ўверх рукі.

— „Значыцца, аднагалосна?... Вот і добра", — адказаў пісар і запісаў у пратакол, што Антон Кіндзюк выбраны аднагалосна зноў за солтыса.

А сяляне, даведаўшыся праз дзьве нядзелі, што Антон Кіндзюк астаўся зноў іхнім старастам, церабілі сабе патыліцы і думалі:

— „Якім жа гэта спосабам?... Гэта-ж мы ўсім сходам галасавалі за тое, каб яго ў солтысы не выбіраць"... Ляо-Дзэ

за родную асьвету! Ваша станоўчасьць і цьвёрдая вера ў лепшыя дні, якіх даб'ёмся мы толькі пашырэньнем асьветы, няхай будзе прыкладам для ўсіх гаротных беларусаў.

Вашы дзеткі — будучае пакаленьне наша — скажа Вам беларускае дзякуй.

Чык-чык.

Спэктакль на вёсцы.

(Косаўскі павет).

У в. Сенькавічы, Борка Гічыцкае воласьці, Косаўскага павету, на Вялікдзень 25 красавіка Драматычным Гуртком моладзі быў пастаўлены спэктакль. Гулялі „Апошняе спатканьне“ — драму Ул. Галубка ў 4-х актах. Глядзельнікаў было поўнае памешканьне. Прысланы былі таксама два паліцыянты ад староства. Ніхто не спадзяваўся, што нашы артысты змогуць так добра згуляць. Толькі дзякуючы высілкам і шчырай працы моладзь наша змагла даць прысутным такое вялікае задаваленьне. Спэктакль адбыўся пад кіраўніцтвам грамадзяніна Пракопа Язэпчыка, якому прысутныя складаюць шчырую падзяку за яго адданую працу для іх і для справы. Зьмест п'есы ўсім вельмі спадаааўся. Асаблівую ўвагу зьвярнулі на галоўныя ролі, на Якіма і Наталку. Публіка была захоплена іхняй шчырай барацьбой за сваю Бацькаўшчыну. Пасьля спэктаклю ўсе з добрым уражаньнем расходзіліся па хатах. Варта было-бы ўсей моладзі зьвярнуць увагу на тую працу, якую вядзе наш Драматычны Гурток і пайсьці за іхным прыкладам. Грошы сабраныя з спэктаклю пойдуць на кніжкі ў бібліатэку, на газэты і наагул на культурна-асьветныя мэты.

Сябра Драматычнага Гуртка
Радзівон Лось.

Водгукі спор.кі аб праўку дарог.

(З Маладэчанскага павету).

У нумары 21 газэты „Народная Справа“ 1926 г. ад 24 верасьня пасол Сабалеўскі ў артыкуле „Новыя парадкі ў новым павеце“ ўказаў на ўсе беззаконьні нашае мяйсцовае адміністрацыі Гарадоцкай гміны пры папраўцы дарогі ў напрамку Горадок-Ракаў. Сяляне вёсак Пажарышчы і Пятроўшчына не маглі перачасіць зьдзекаў і зьвярнуліся да паслоў Сойму з просьбай аб зашчыце. Цяпер трох з іх адміністратыўна пасадзілі ў Маладэчне пад арышт на 7 дзён. Але і на гэтым ня быў яшчэ канец. А сёлета на дзень 22 сакавіка былі вызваны, як сьведкі, Маладэчанскім сьледавацелем некалькі сялян у справе дарожнай. Трэба было „zbadać“ яшчэ грамадзяніна Ігнатовіча, які па просьбе сялян напісаў аб крыўдах іх паслом Сойму. Ня гледзячы на тое, што ўсё сьведкі паказалі праўду, што Ігнатовіч не агітаваў процi папраўкі дарогі, за невыкананьне распараджэньня ўладаў, сьледавацель Маладэчанскага павету абвініў Ігнатовіча з арт. 129 на п. п. 3 і 6. К. К. і 24 сакавіка арыштаваў яго і адправіў у Вялейскі вастрог, зразумела, скаванага.

Аднак-жа 24 красавіка Акружны суд ў Вільні Ігнатовіча з поваду бездаводнасьці віны, звольніў з турмы. З турмы то звольнілі, але хто верне яму страчаннае здароў'е і страты зьвязанныя з арыштам і ў гаспадарцы?

Спачуваючы.

З Радавае Беларусі.

Ластоўскі ў Менску.

26 красавіка ў Менск прыехаў з сваей сям'ёй на сталае жыцьцё грам. Вацлаў Ластоўскі, якога літоўскі фашыстаўскі ўрад выкінуў з Коўны, дзе Ластоўскі жыў некалькі гадоў, як даверная асоба ўсіх папярэдніх урадаў, змагаючыся з орыентацыяй беларускага грамадзянства на Менск.

Вось дзе спраўдзілася расейская прыказка: „не плюй в колодезь, — пригодится воды напиться“...

Беларусы ў Латвii.

„Школьная Праца“, часопісь дзьвінскае дзяржаўнае беларускае Гімназіі. № 7 студзень—люты, 1927.

Зьмест гэтага нумару даволі ўдачны і багаты. Варты ўвагі вершы, а таксама рысункі, поўныя закончанасьці і глыбіні (лес). Казка—песьня „Фея“ прадстаўляе сабой надта прыгожы ўзор фантастыкі. Мова багатая, поўная абразоў, ды сам сюжэт так разьвіты, што захапляе чытача, ня гледзячы на прасьціню. Ёсьць і народныя песьні, добра было-б дапісаць да іх музыку.

З хронікі даведываемся, што ў Латвіі ідзе шырокая культурная праца. Было некалькі спэктакляў на правінцыі і ў самым Дзьвінску, на якіх ставіліся беларускія п'есы. У Гімназіі маюць сьвяткаваць 5-лецьце існаваньня Дзьвінскае Беларускае Гімназіі.

З тэхнічнага боку таксама часопісь робіць добрае ўражаньне. Бязумоўна, добра было-б, каб і беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі выдавалі свае пэрыодычныя часопісі, у якіх-бы магла праяўляць свае здольнасьці наша моладзь.

На жаль толькі, як піша, відаць, асьвядомлены „Голас Беларуса“, вучні штораз меньш актыўна прымаюць учасьце ў сваей часопісі, а пішуць у ей стацьці — вучыцялі. Калі гэта—так, дык трэба было-б дырэкцыі гімназіі зрабіць усё залежнае ад яе, каб уся часопісь была творам самае моладзі: інакш цана яе шмат зьмяншаецца.

Беларусы ў Амэрыцы.

Дапамога Бацькаўшчыне.

Сярод беларускіх эміграптаў усё больш пашыраецца сьвядомасьць абавязку дапамагаць сваей Старой Бацькаўшчыне, чым хто можа. Дык усё больш і больш ахвяр зьбіраецца на беларускую культурна-асьветную працу ў Зах. Беларусі. Апрача збораў на прэсу, на гімназіі ў Глыбокім, ды інш., зьбіраюцца грошы на ладжаньне народных дамоў і бібліатэк-чытальняў на вёсках, і эмігранты ахвотна складаюць ахвяру на гэткія ўстановы ў сваей роднай вёсцы. Прыкладам, астраўчане (з Слонімшчыны) сабралі 25 даляраў на Народны дом у родным Востраве.

Хай жа кожная вёска, з якой эмігравалі людзі ў Амэрыку, атрымае ад сваіх эмігрантаў такую дапамогу на асьветныя справы! Хай дома—ў Старой Бацькаўшчыне — добрым словам памянуць сяляне сваіх братоў, што перабраліся ў Новы Сьвет.

З Таварыства Беларускае Школы.

А ўсё стараюцца...

У Галоўную Управу Таварыства Беларускае Школы ў Вільні.

Жыхароў вёскі Ялова, гміны Сухапольскае, Пружанскага пав.

ЗАЯВА.

Даводзім да ведама Галоўнае Управы, што дня 14 красавіка гэтага году прыйшоў паліцыянт Гандзер з Сухапольскага пастарунку з дазорцам школьным Макоўскім, ён-жа вучыцель вёскі Сухаполь, да нас у вёску Ялава і не заходзячы да солтыса пайшлі ў склеп, дзе выпіўшы і закусіўшы сталі чакаць вечара. Калі сьцямнела, пайшлі па вёсцы і, заходзячы да каждае хаты, трэбавалі партыйныя білеты Грамады, а калі сяляне казалі, што яны ня былі ні ў якой Грамадзе, то вучыцель і пастарунковы, лаючыся брыдкімі славамі, як належыць гэта „інтэлігентным“ людзям, і пагрозамі змушалі расьпісацца на невядомым паперы, закрытым зьверху лістом чыстае паперы.

Калі хто адмаўляўся ад подпісу, трэбуючы ад іх паказаць той папер, на якім расьпісвацца, то яны ўцякалі, кажучы, каб ішоў на „jutro o 6-ej godzinie do posterunku“.

Многія, не асьвядомленыя ў гэтай справе, баючыся пагроз гэтых інтэлігентаў расьпісаліся. Прышоўшы ў хату і не застаўшы бацькоў, паны гэныя змушалі падпісвацца дзяцей, а калі яны адмаўляліся, што ня ўмеюць пісаць, то бралі іх за рукі і рукою падпісвалі.

Так хадзілі яны па нашай вёсцы ад 7-ае гадзіны да 10 увечары, а на другі дзень ізноў хадзілі, але ўжо сяляне, даведаўшыся адзін ад аднаго, чаго гэтым паном трэба, не падпісваліся, а яны, забраўшы свае лахі пад пахі, пайшлі, каб мы іх больш і ня бачылі.

Бачучы такую несправядлівасьць, якую вырабілі гэтыя паны ў нашай вёсцы, просім Галоўную Управу даць тым сялянам, каторыя расьпісаліся якуюсь параду, іх у нас налічваецца каля 15, з іх чатыры зложылі дэкларацыі на беларускую школу, а рэшта былі не дэкларанты.

Дня 18 красавіка г. г.

Сьцьвярджаем усе гэтыя паступкі і сьведчым гэта сваімі подпісамі сяляне вёскі Ялава. (Подпісаў 7).

Косаўцы працуюць.

Сход сяброў Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Булле Косаўскага павету.

У нашай вёсцы 17-га красавіка г. г. адбыўся сход сяброў Гуртка Т-ва Беларускае Школы. На парадку дня стаялі такія пытаньні: 1. Справа бібліятэкі-чытальні, 2. Справы Народнага Дому, 3. Бягучыя справы. Прысутных на сходзе было 25 сяброў. Дзеля таго, што Народны Дом ужо адрэмантаваны— на прапанову сябры Нічыпара і Нядбаліка пастанавілі аднагалосна перанясьці бібліятэку-чытальню ў Народны Дом. Тут выясьнілася вельмі няпекная справа бышага загадчыка бібліятэкі-чытальні Якуба Макарэвіча. У свой час сябры Гуртка зьвярнуліся да грамадз. Макарэвіча, каб ён даў ім сцэнічныя творы дзеля пастаноўкі спэктаклю. Але замест кніг сябры атрымалі ад яго такі адказ: „калі я захачу, дык вы не паставіце спэктаклю і, што, калі я захачу, дык выганю вас з Народнага Дому“. На сходзе паўстала пытаньне, як аднясьціся да такога загадчыка. Запрапанавана было Макарэвічу апраўдацца ад гэтых закідаў і ўзяць свае словы назад. Але ён адмовіўся апраўдывацца і сказаў, што і цяпер стаіць на тым, што казаў перш сябрам, прасіўшым у яго сцэнічныя творы. У адказ на гэта сход аднагалосна пастанавіў перавыбраць загадчыка бібліятэкі-чытальні. На новага загадчыка была выстаўлена кандыдатура Арцема Анішчыка, які і быў выбраны аднагалосна.

У справе Народнага Дому Міхал Гардзейка прапанаваў, каб ажыцьцёвіць яго спэктаклямі. Дзеля гэтага прасіў сход дазволіць яму выбраць з моладзі супрацоўнікаў. Сход вынес падзяку за яго дасюлешнюю працу ў Народным Доме і пастанавіў паставіць спэктакль на Вялікдзень. За білеты на спэктаклі пастанавілі браць ад 1 зл. да 50 гр.

У бягучых справах разглядалася справа рэвізыйнае камісіі. Сход пастанавіў выбраць рэвізыйную камісію, якая-б наглядала за працай прэзыдыуму Гуртка, з такіх асоб: Рыгора Гароха, Цімоха Бурдзя і Ціхана Жука.

Гэтым агульны сход і закончыў сваю працу.

Культурнік.

Зноў арышты ў Стаўпецкім павеце сярод культурных працаўнікоў.

У Стаўпецкім павеце адбыліся зноў арышты. У гэтым выпадку пацярпелі найбольш сябры Т-ва Беларускае Школы. Як звычайна, арыштаваных зараз жа павялі на баданьне. Некаторых з іх звольнілі, некаторых пасадзілі за краты. Іншыя пад пагрозай арышту змушаны былі адмовіцца ад працы ў Т-ве. Так з Мірскай Акружнай Управы адмовіліся ад сваіх абавязкаў сябры: Пётра Рантоўскі і Ганна Пуляшко. Ціхана Бухаўца арыштавалі. Сьцяпан Лімант і Янка Гілейша адміністрацыйна пакараны па месяцу вастрогу. У сяброў Ясэвіча Мікалая, Качановіча Міхася і Ганны Сташэўскае адбыліся вобыскі. Шукалі, як звычайна, „камуністычнай бібулы“. Ясна, што нічога кампрамітуючага ня знойдзена. Такім чынам стэрарызаваная люднасьць ня можа весьці пляновай культурнай працы. Шмат сяброў Т-ва Беларускае Школы адміністрацыйна адбываюць кару. Зразумела, што арышты гэтыя амаль што зусім прыпынілі культурна-асьветную працу Т-ва Беларускае школы ў Стаўпецкім павеце.

Цяпер трэба будзе зноў пачынаць усё амаль што ад пачатку. Перш за ўсё трэба, каб Мірская Акружная Управа Т-ва зрабіла зьезд прадстаўнікоў Гурткоў Т-ва Стаўпецкага павету. Мусіць лепш было-бы, каб новая Акружная Управа Т-ва асела ня ў Міры, як гэта было да гэтага часу, а ў самых Стоўпцах. Мір — гэта места даволі глухое, далёка ад чыгункі, а галоўнае ад адміністрацыйнага цэнтру, бо староства павету знаходзіцца ў Стоўпцах, так што за кожнай дробязяй, датычачай арганізацыйных спраў Т-ва, трэба спэцыяльна ехаць у Стоўпцы. Апошняе шмат перашкаджае ў працы Стаўпецкае Акружное Управы Т-ва. Зразумела таксама, што, чым далей ад адміністрацыйнага цэнтру, тым болей самавольства. Хай падумаюць добра над усім гэтым сябры Т-ва Стаўпецкага павету. Ці ня лепш будзе ўжо цяпер рабіць зьезд прадстаўнікоў ад Гурткоў Т-ва Стаўпецкага павету ня ў Міры, а ў Стоўпцах?

Міранін.

Усячына.

З сучасных анэкдотаў.

На спатканьні Новага Году, у супольным гнязьдзе хадэкаў і сельсаюзьнікаў на Полацкай вуліцы ў Вільні сёлета адбылася сустрэча Новага Году.

Сабраліся разам Ярэміч з Мамонькай, Рагуля з Аўсянікам, ды жменька залежных ад іх людзей. Залучылі й аднаго сэнатара...

Хоць і цесная была кватэра, ды пуста было ў ей: адвакаты ня прыехалі, іншыя не хацелі, дамы „захварэлі“... Пуста, сумна, шэра...

Што-ж зробіш? Налягалі на гарэлку, і хутка настроі крыху павясялелі. Пачаліся прамовы

Адзін з прамоўцаў, успомніўшы эвангельле, сказаў, што дагэтуль ад беларускіх дзеячоў вымагаліся дзьве эвангельскія цноты: каб былі чыстыя маральна, як галубы, і адважныя, як львы. Але цяперашняе жыцьцё вымагае балей — трэцяе цноты: каб былі мудрыя, як зьмеі. „Дык вып'ем за гэтую мудрасьць зьмяіную“! — закончыў сваё слова прамоўца.

Раптам з мейсца, дзе драмаў мірна пасол Аўсянік, раздаўся ўзбураны голас:

— „Пратэстую!!! За Луцкевіча піць ня буду“!..

. . . .

Доўга ўзбуранае сабраньне ня ведала, як яму зрабіць з тостам, які выклікаў непаразуменьне. Урэшце „свой“ сэнатар даў саламонавую раду: „Хто хоча мудрасьці, хай п'е! Каму яна лішняя, можа ня піць“...

Блізу ўсе чаркі гэтым разам асталіся поўнымі... Забава зусім папсавалася...

„Ложью весь свѣтъ пройдешь, а назадъ не вернешься“...

Пасол Рагуля, які ў часе выбараў 1922 году здабыў сабе вялікую папулярнасьць у сваім павеце, ходзячы па вёсках у лапцях і абарваны ды агітуючы за „шаснастку“, — прыпомніў свае старыя пасьпехі і надумаўся тым-жа спосабам заваяваць утрачанае за апошнія гады даверые масаў. Узяў кіёк, торбачку на плечы, ды лапаткі на ногі, дый пайшоў ад вёскі да вёскі, усюды агітуючы за „Сялянскі Саюз“.

Але ня доўга хадзіў пан пасол. У адной вёсцы, пазнаўшы яго, проста адвярнуліся ад яго. У другой ветліва папрасілі ісьці сваей дарогай далей... Толькі ў трэцяй ці чацьвертай прынялі ў хату, наклікалі больш людзей і пачалі пільна слухаць, што гаварыў пан пасол.

Пасол Рагуля пачаў з таго, што ўраніў колькі кракадзілавых сьлёз па... „Грамадзе“! „Але не бядуйце“! — пацешыў ён тут-жа сялян: „запісавайцеся ў наш „Сялянскі Саюз“, гэта-ж тое самае“!

— „А як-жа сельсаюз кажа аб зямельцы“?—папытаўся нехта з прысутных.

— „Ды ведама: усім надзяліць зямлі“!— адказаў пасол.

— „І бяз выкупу“?

— „Ведама, бяз выкупу“!

— „Ну, а чаму-ж гэта пан пасол сам не чакаў гэнага падзелу і купіў сабе ласы кусок зямлі, дый за гатовыя грошы“? — спытаўся ізноў той жа селянін.

Пачуўся дружны рогат у прысутных. Пан пасол пачырванеў, націснуў шапку на вушы ды пусьціў крылатае „трохэтажнае“ слова на „родномъ русскомъ языкѣ“, папёр вон із хаты...

Далей, здаецца, ужо не хадзіў, а паехаў у Вільню пісаць з Ярэмічам „сакрэтныя мэморыялы“....

УВАГА! УВАГА!

ГРАМАДЗЯНЕ! Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы адчыняець у Вільні

Вячэрнія Курсы для дарослых беларусаў.

Праграма курсаў: арытмэтыка, геаграфія, гісторыя, беларуская мова, рысаваньне і архітэктурнае чырчэньне.

Запіс на курсы прыймаець кіраўнік Курсаў сябра Мітрафанаў штодзень ад 5 да 7 гадзіны ўвечары ў памяшчэньні Курсаў (Новы Сьвет Беларуская народная школа пры Нова-Сьвецкай царкве).

Аб пачатку лекцыяў будзе павядомлена ў газэтах.

ГАЛОЎНАЯ УПРАВА.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.